CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

**Міністэрства замежных спраў Польшчы**

**“Польшча 89’– Беларусь 91’ – нераўназначныя змены”**



Калі ў чэрвені 1989 года палякі ішлі галасаваць на дэмакратычных выборах, якія сталі вынікам перамоваў “Салідарнасці” з кіраўніцтвам краіны, ніхто не мог прадбачыць, што на працягу двух наступных гадоў адным з далёкіх вынікаў гэтага польскага поспеху будзе распад Савецкага Саюзу і пачатак незалежнай Беларусі.

Для Польшчы 1989 год з’яўляецца адной з найважнейшых датаў у гісторыі. Ці мае 1991 год падобнае значэнне для Беларусі? Як беларусы ўзгадваюць перамены 1989 і 1991 года?

Ці можна параўнаць папярэднія 20 гадоў у Польшчы і Беларусі? Як скаліся лёсы дзвюх дзяржаваў-суседак і ці маглі яны скласціся інакш?



Калі ў 2004 годзе Еўрапейскі Звяз правёў найвялікшае ў гісторыі пашырэнне сваіх межаў і ўключыў, сярод іншага, у свой склад Польшчу, стала зразумела, што польскае кіраўніцтва будзе ствараць з краіны галоўнага ініцыятара ўсходняй палітыкі ўсёй садружнасці. Для ўладаў Польшчы было важна, каб пашырэнне Еўрапейскага Звязу не стала прычынай гаворкі пра новы падзел Еўропы, новую заслону на рацэ Буг, што паўплывае на тое, што праблемы Беларусі і Украіны стануць далёкімі і нецікавымі.

**Цэнтр міжнародных зносінаў (Centrum Stosunków Międzynarodowych) і партал Belarus-Live.eu абвяшчаюць конкурс найлепшых артыкулаў, эсэ, рэпартажаў з Беларусі. Тэма: <u>“Польшча 89’ – Беларусь 91’ – нераўназначныя змены”</u>.**

Чакаем цікавыя рэпартажы, фота-рэпартажы, эсэ, артыкулы, аналітыку. Нас цікавяць усе падзеі, якія, на Вашую думку, паўплывалі на мінулыя 20 гадоў, чакаем Вашага ўспрымання Беларусі, Польшчы і ўзаемных дачыненняў (палітычных, сацыяльных, культурных). Перш за ўсё чакаем Вашых меркаванняў!

**Умовы ўдзелу:**

- **У перыяд да <u>10 VIII 2009г.</u>** уключна даслаць працы на электронны адрас: **konkurs@csm.org.pl**
- Праца павінна таксама з’явіцца на старонках рэгіянальнай прэсы ў Беларусі (*выданне можа быць папяровым ці інтэрнэт-выданнем*).
- WebSite: www.csm.org.pl ці http://www.csm.org.pl/?s=news&aid=233

Аб’ём: 8000 – 10000 знакаў (з прабеламі).

Праца павінна быць напісана па-беларуску ці па-руску.

Міністэрство замежных спраў Польшчы

**УЗНАГАРОДЫ:**

- Аўтары 20 працаў атрымаюць аўтарскі ганарар;
- 10 аўтараў найлепшых працаў акрамя ганарару атрымаюць запрашэнне да ўдзелу ў тыднёвым навучальным візіце ў Польшчу.

**Тэматыка навучальнага візіту:**

- Польшча 1989 – 2009 – рэформы і змены
- Польшча ў Еўрапейскім Звязе (уплыў, роля, значэнне)
- Мэты і выклікі польскай замежнай палітыкі ва “Усходнім партнёрстве” (Што гэта? Чаму было створана? Якія яго мэты?)
- Што такое “еўрапейская інтэграцыя”?
- Новы Еўрапарламент – новыя магчымасці?

Удзельнікі навучальнага візіту атрымаюць унікальную магчымасць правядзення сустрэчаў і размоваў з супрацоўнікамі МЗС, канцылярыі прэм’ера і прэзідэнта, якія непасрэдна ўплываюць на польскую палітыку. У праграме таксама прадугледжаныя сустрэчы з грамадскімі дзеячамі, супрацоўнікамі ВНУ і вучонымі.

Навучальны візіт плануецца на ***верасень 2009 г***. Дакладная інфармацыя будзе паведамленая пераможцам.

Конкурсныя працы будзе ацэньваць журы, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі Цэнтра міжнародных зносінаў (Centrum Stosunków Międzynarodowych), Міністэрства замежных спраў Польшчы, БАЖ.

ШТО ТАКОЕ “ЦЭНТР МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН”?

“Цэнтр міжнародных адносін” – гэта незалежны, няўрадавы асяродак, які займецца польскай замежнай палітыкай і найбольш істотнымі для яе праблемамі. Асноўнае заданне Цэнтру – палітычныя кансультацыі, сталы маніторынг знешнепалітычных дзеянняў ураду, а таксама – апісанне актуальнай міжнароднай сітуацыі ў Польшчы. З гэтай мэтай мы рыхтуем справаздачы і аналіз, арганізоўваем канферэнцыі і семінары, публікуем артыкулы і кніжкі, вядзем даследчыя праекты і рабочыя групы. Напрацягу гматгадовай дзейнасці ў нас атрымалася стварыць кола сталых супрацоўнікаў і збудаваць дыскусійны форум аб замежнай палітыцы для палітыкаў, парламентараў, дзяржаўных і лакальных чыноўнікаў, журналістаў, навукоўцаў, студэнтаў і прадстаўнікоў іншых няўрадавых арганізацый. Мы лічым, што перад сённяшнімі выклікамі польскай знешняй палітыкі мы павінны падтрымліваць грамадскія дэбаты такога кшталту ў Польшчы і аб польскай міжнароднай палітыцы.

**Centrum Stosunków Międzynarodowych**
ЦЭНТР МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН
The Center for International Relations

Ul. Emilii Plater 25
00-688 Warszawa
Tel. +48 22 646 52 67/68
Fax +48 22 646 52 58
E-mail: info@csm.org.pl